# БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКІЯ ЎЗАЕМАДАЧЫНЕННІ Ў XVII – XVIII стст.: ПРАВАСЛАЎНАЯ АПАЗІЦЫЯ Ў РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

**Барсук Елена Евгеньевна**
дацэнт УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт (г. Мазыр, Беларусь)

Актыўнае пашырэнне Берасцейскай царкоўна-рэлігійнай уніі, афіцыйнае скасаванне праваслаўнай іерархіі, передача храмаў і кляштараў уніятам мабілізавала праваслаўных вернікаў на барабьбу за свабоду веравызнання ў Рэчы Паспалітай [1, с. 98]. У выніку абвастрэння міжканфесійнай барацьбы ў XVII–XVIII стст. узрастае значэнне канфесійнага фактару ў сацыяльна-палітычным і культурным жыцці дзяржавы. Складаецца агульная праваслаўная апазіцыя на беларускіх і ўкраінскіх землях.

Адным са сродкаў барацьбы з наступам Контррэфармацыі была дзейнасць праваслаўных брацтваў амаль ва ўсіх буйных гарадах і мястэчках Беларусі і Украіны. Старэйшымі і найбольш уплывовымі брацтвамі лічыліся Львоўскае Успенскае і Віленскае Свята-Духаўскае, якія першымі атрымалі статус стаўрапігіі і былі «ініцыятарамі і арганізатарамі рэлігійна-асветніцкіх устаноў» [2, с. 42]. Яны займаліся школьнай справай, мецэнацтвам, адчынялі друкарні і шпіталі, вялі актыўную рэлігійную палеміку з каталіцкімі і уніяцкімі аўтарамі. Львоўскае брацтва вызначалася значным уплывам на грамадска-палітычнае і рэлігійнае жыццё, аднак школьная справа знаходзілася на больш нізкім узроўні. Так, А. Крылоўскі адзначаў: «Въ Виленской школѣ (1619 г.) было пять отдѣленій; въ Кіевской – братской (до преобразованія ея П. Могилою) – четыре. Сколько было отдѣленій въ Львовской – неизвѣстно, но едва-ли, по крайней мѣрѣ, менѣе трехъ» [2, с. 243]. Менавіта Львоўскае і Віленскае брацтвы сталі ўзорамі дзейнасці іншых брацтваў: у Бярэсці, Менску, Магілёве, Кіеве, Гарадку (на Валыні), Перамышлі, Луцку, Шклове, Полацку, Пінску, Оршы [3, с. 153]. На думку Кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы, праваслаўе выстаяла перад націскам каталіцтва і уніі ў значнай ступені дзякуючы брацтвам [4, с. 71].

Значнымі накірункамі дзейнасці беларуска-ўкраінскай праваслаўнай апазіцыі былі рэлігійная палеміка і выдавецкая дзейнасць, якой пераважна займаліся брацтвы і манастыры. Большасць твораў рэлігійна-палемічнай літаратуры XVII ст. з'яўляецца агульным беларуска-ўкраінскім здабыткам культуры. У творах Герасіма і Мялеція Сматрыцкіх, Захарыя Капысценскага, Лявонція Карповіча, Андрэя Мужылоўскага, Стэфана Зізанія, Сільвестра Косава, Афанасія Філіповіча і іншых, абмяркоўваліся пытанні не толькі рэлігійна-царкоўнага, але і грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы і чалавека [5, с. 156].

У 20-я – пачатку 30-х гг. XVII ст. набывае вядомасць Кіеўская брацкая школа, заснаваная былым рэктарам Львоўскай школы Іовам Барэцкім, які пазней стаў Кіеўскім мітрапалітам. Яна размяшчалася на зямельным уладанні, падараваным Богаяўленскаму манастыру жонкай мазырскага маршалка Стэфана Лозкі Лізаветай 14 кастрычніка 1615 г. спецыяльна для брацтва і школы [6, с. 12–17]. Увогуле дзейнасць гэтай брацкай школы з'яўляецца адной з самых



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цікавых культурных з’яў на беларускіх і ўкраінскіх землях. Кіраўнікамі школы былі беларусы Спірыдон Собаль, Фама Іеўлевіч і інш. [7, с. 62–64]. На думку ўкраінскага даследчыка Я. Д. Ісаевіча, Кіеўскае брацтва мела больш магчымасцей, чым Львоўскае ці Луцкае, таму што знаходзілася пад абаронай казакоў. Войска Запарожскае на чале з гетманам Пятром Канашэвічам Сагайдачным у 1620 г. запісалася ў брацтва. Гэтая падзея занатавана ў вершах другога рэктара школы Касіяна Саковіча, надрукаваных у 1622 г. у лаўрскай друкарні [8, с. 322–338]. Дзякуючы падтрымцы казацкага гетмана Пятра Канашэвіча Сагайдачнага, у гэтым жа 1620 г. Іерусалімскі патрыярх Феафан падчас вяртання з Масквы на Бліжні Усход надаў Кіеўскаму брацтву статус стаўрапігіі і аднавіў праваслаўную іерархію на беларускіх і ўкраінскіх землях. Казакі ахоўвалі ў Кіеве патрыярха Феафана «аки пчелы матицу свою» [9, с. 71]. Ён прызначыў Кіеўскім мітрапалітам Іова Барэцкага, епіскапамі Полацкім – Мялецію Смятрыцкага, Перамышльскім – Ісайю Капінскага, Уладзімірска-Берасцейскім – Ізэкііла Курцэвіча-Булыгу, Холмскім – Паісія Іпалітовіча, Луцкім – Ісайю Барыскавіча, Пінскім – грэчаскага епіскапа Аўрамія, які суправаджаў Феафана [9, с. 75].

Пасля прызначэння архімандрытам Кіева-Пячорскай лаўры ў верасні 1627 г. Пятр Магіла заснаваў лаўрскую школу, яе рэктарам і прафесам філасофіі стаў Ісая Трафімовіч-Казлоўскі, а прэфектам – Сільвестр Косаў, запрошаныя з Львоўскай школы. Магчымая канкурэнцыя брацкай школе выклікала незадаволенасць казацтва, часткі святарства і насельніцтва Кіева. [6, с. 407]. Каб захаваць школу, П. Магіла 11 сакавіка 1631 г. уступіў у Кіеўскае брацтва і пад ціскам запарожскіх казакоў пагадзіўся на аб’яднанне лаўрскай школы з брацкай і яе размяшчэнне на месцы Богаяўленскай школы [6, с. 410–411]. Відавочна, што спадкаемцай Кіеўскай брацкай школы лічылася Кіева-Магілянская калегія. Навучанне ў ёй давала добрую падрыхтоўку для працягу адукацыі ў лепшых еўрапейскіх універсітэтах. Першапачаткова пераважнай мовай выкладання была лацінская, па формах і асноўным змесце навучання ўстанова мала адрознівалася ад каталіцкіх і пратэстанцкіх школ падобнага ўзроўню, але значная ўвага ўдзялялася грэка-славянскай традыцыі. Іерусалімскі патрыярх Паісій, які наведаў Кіеў у 1649 г. адзначаў, што тут дзейнічае школа «славянскай мовы», у якой ёсць «настаўнікі высокога мастацтва». Яны навучаюць набожных юнакоў «славянскай мове як уласнай і лацінскай, як неабходнай тым, што жывуць паміж лацінянамі» [10, с.80].

Пасля смерці П. Магілы Богаяўленскі манастыр і калегіум фактычна падпарадкоўваліся пераемнікам Магілы на мітрапаліцкай кафедры. У другой палове XVII–XVIII стст. назва «брацкі» традыцыйна далучалася да назвы Богаяўленскага манастыра і школы, аб чым сведчаць наяўныя ў крыніцах назвы «Кіева-брацкі калегіум», «Кіева-брацкі манастыр» [11, с. 102]. Большасць праваслаўных брацтваў у канцы 30-х гг XVII – пачатку XVIII стст. паступова страчвае свой уплыў. Па выразе Крылоўскага, «религиозно-просвѣтительное значеніе умаляется и... отъ нихъ остаются слабые, едва замѣтные, слѣды» [2, с. XVIII].

У пачатку XVII ст., як адзначалася вышэй, казацтва адкрыта выступіла ў абарону праваслаўных вернікаў у Рэчы Паспалітай, іх намаганнямі была аднаўлена праваслаўная іерархія, прымаліся соймавыя пастановы аб свабодзе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

веравызнання. Аднак рэзка адмоўная пазіцыя да ўніяцтва абумовіла нарастанне міжканфесійнага супрацьстаяння. Падчас падзей 1648–1667 гг. на беларускіх і украінскіх землях казацтва выкарыстоўвала праваслаўе ў якасці баявога сцяга.

## Літаратура


1. Киприанович, Г. Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве с древнейшего времени до настоящего времени / Г. Я. Киприанович. – 2-е изд., доп. – Вильно, 1899. – 288 с.
2. Крыловский, А. Львовское ставропигиальное братство. Опыт церковно-историчекого исследования / А. Крыловский. – Киев : типография Императорскаго университета Св Владимlра Акц. общ-ва печ. и издат, дела Н. Т. Корчак-Новицкого. Мерингов. ул. № 6, 1904. – 235 с.
3. Голубев, С. Т. История Киевской духовной академии. Вып. 1 : Период до-Могилянский / С. Т. Голубев. – Киев : Унивеситет. Тип., 1886. – 235 с.
4. Ничик, В. М. Образ идеального властителя в сочинениях Петра Могилы / В. М. Ничик // Человек и история в средневековой философской мысли русского, украинского и белорусского народов : сб. науч. трудов. – Киев : Наук. Думка, 1987. – С. 122–131.
5. Майхровіч, С. К. Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV–XVIII стст. / С.К. Майхрович. – Мінск, 1980. – 254 с.
6. Памятники изданные Временною комиссиею для разбора древних актов. – Киев, 1846. – Т. 2. – 777 с.
7. Ісаевич, Я. Джерела з історії української культури / Я. Ісаевич. – Київ, 1972. – 142 с.
8. Українська поезія. Кінець XVI – початок XVII ст. – Київ, 1978. – 431 с.
9. Василенко, Н.П. Очерки истории Западной Руси и Украины. – Киев : Изданіѳ книжнаго магазина Н. Я. Оглоблина, Крѳщатикъ, 33. – 590 с.
10. Исаевич, Я. Преемники первопечатника. – Москва, 1981. – 192 с.
11. Медынский, Е. Н. Братские школы Украины и Белоруссии в XVI–XVII вв. и их роль в воссоединении Украины с Россией / Е.Н. Медынский. – Москва, 1954. – 158 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова